# ВЕРАСЕНЬ

**5/23. Лупа**. Святы хрысціянскі пакутнік Лупа (канец III – пачатак IV ст.) занатаваны народам ў прыказцы: «Сей на Лупа, то будзе жыта купа». Вядома і прыкмета: у дзень памяці святога Лупы нельга сеяць жыта, таму што на ўсёй ніве будуць «лупы» – жыта ўзыйдзе і вырасце плешынамі (Нікіфароўскі, 1897).

Ва ўкраінцаў і рускіх таксама маюцца згадкі пра святога ў малых жанрах фальклору.

**7/25. Баўтрамей (Варфаламей)** – час сяўбы азімых. «Прыйшоў Баўтрамей – жыта на зіму сей» (Чачот, 1846; Кіркор, 1858; Федароўскі, 1935). У Расіі Варфаламея называлі Жытасеем. З'яўляецца шмат аваднёў і мух. З тае нагоды ўзнікла прыказка: «Святы Баўтрамей душыць аваднёў і труціць мух» (Паўлюкоўскі, 1934). Замацаванае за ім выслоўе «Святы Баўтрамей высылае буслоў па дзяцей» сведчыць аб адлёце птушак і пачатку вясенняй пары.
Па стану надвор'я на дзень прысвятка прадказвалі аб надвор'і на ўсю восень.

Падобныя прыкметы і прымаўкі пра Барталамея (25 жн.) наглядаюцца ў палякаў: Swiety Bartlomieju, trymaj kozuch na ramieniu (плячах) (КЗ, 1978. С. 178).

Апостал Варфаламей жыў у VI стагоддзі.

**8/26.** ***Другая Прачыстая (Меншая Прачыстая, Малая Прачыстая, Другі святок).*** У Заходняй Беларусі гаварылі: «Прыйшла Меншая Прачыста, канчай сеяць начыста» (БГК, 1926).

Палякі свята называюць Маці Божая Сеўная (Matka Boska Siewna), напярэдадні якога абавязкова селянін павінен зрабіць «засевак» (КЗ, 1978. С. 178). У скандынаўскіх народаў дзень Марыі ў народным календары пазначаны ножніцамі, бо пачыналі стрыгчы авечак.

**10/28. Мацей (Майсей, Маісей Мурын, Мурун)** – абаронца ад запойнага п'янства. Прысвятак вельмі прызнавалі жанчыны, чые мужыкі пілі гарэлку (Раманаў, 1912). Існавалі і прыказкі: «Майсей Мурын – сцаліцель ад п'янства» (Паўлюкоўскі, 1934); «Пасля Мацея мужык на полі не пацее» (Рапановіч, 1974).

Даследчыкі (Усаў У.) выказваюць меркаванне, што падставай для прызнання прападобнага Маісея Мурына (каля 400 г.) як абаронцы ад п'янства з'яўляецца тое, што ён у маладосці займаўся разбоем і п'янствам, але затым пры дапамозе Бога прызнаў свае грахі, пакаяўся і стаў падзвіжнікам строгай набожнасці.

**11/29. Калінавік (Іван Калінавік, Ян, Галавасек, Іван Крываўнік, Іван Постны, Галаварэз, Сценцель, Сценціян).** Назва замацавалася ад царкоўнага найменя дня «Адсячэння галавы

Прарока, Прадцечы і Хрысціцеля Гасподня Іаана». У народзе ўсталяваліся за ім бытавыя прыкметы і павер'і. Лічылася, што нельга рэзаць, сячы круглае (капуста, бульба і г.д.) і нават есці. На Тураўшчыне, закончыўшы некаторыя палявыя работы, засякалі старога пеўня і рыхтавалі вячэрню (Тураўскі слоўнік, 1982). У Рэчыцкім павеце не мылі галаву, каб не захварэць на каўтун (Пяткевіч, 1938). Пчаляры «падглядалі» мёд. На Магілёўшчыне прыкмячалі: калі пасеяць ў гэты дзень жыта, то будзе ўраджай «умалотны» (Дамбавецкі, 1882). На Ўсходнім Палессі стараліся завяршыць сяўбу абавязкова за дзень, а вечарам дзяўчаты выходзілі віць вянкі, спявалі песні (Талстая, 1986). На Калінавіка збіралі ягады каліны, журавіны выкарыстоўвалі ад боляў галавы.

Настаў час руплівай працы ў полі – збору ўраджаю, калі дождж ўжо не патрэбен. У народзе гаварылі: «Да Яна прасіце, дзеткі, дажджу, а па Яне я й адзін упрашу» (Паўлюкоўскі, 1934; Кіркор, 1858; Слупскі, 1892). З Калінавіка да Цудаў, Багача, Пакровы (у розных раёнах па-свойму) гэтая пара называлася **Бабіна лета –** пачатак жаночых сельскагаспадарчых работ (Дабравольскі, 1914). Гавораць: «Ян па лета прыйшоў, а ўжо восень знайшоў» (БСК, 1937). Пачыналіся сялянскія вяселлі, асабліва пасля Івана Пакроўнага, Пакровы да Піліпаўкі.

Ой, на гарэ ячмень жала,
Снапоў не вязала,
Каго верна любіла,
Праўды не казала.
*(Свянцянскі павет;*
*Шэйн, 1887)*

На гарэ лён, белы кужаль.
Не з кім стаці, не з кім стаці лёну браці.
*(Гомельскі павет;*
*Радчанка, 1888)*

Чыя ж то пшаніца,
Што колас пахіліўся?
То ж таго казака,
Што шчэ не жаніўся.
*(Лепельскі павет;*
*Раманаў, 1912)*

Ой, рыкнула каровачка,
З поля ідучы,

Парадзіла мяне маці,
Ягады беручы.
*(Столінскі раён)*

Падобныя звычаі, асабліва пра забароны на рэзанне, наглядаліся ў народаў Югаславіі, якія таксама звязваюцца з хрысціянскай гісторыяй аб адсячэнні галавы Іаану Хрысціцелю. Адпаведныя існавалі і назвы прысвятка: Усекованије, Усіјеk, Секованције і інш. у сербаў і чарнагорцаў; Usikovac і інш. у харватаў. Акрамя звычаяў, звязаных з царкоўным святым, у сербаў на гэты дзень прымяркоўваліся і язычніцкія звычаі, звязаныя з культам продкаў (с. 216).

Рускія ў гэты дзень пасціліся «Не соблюдешь Иван-пост, пришемишь в аду хвост!». Немцы лічаць, што дождж на Івана псуе ўсе арэхі «Regnet es an Jahann Enthanpung, verocerben alle Nusse» (Ярмолаў, 1901. С. 432).

**13/31. Кіпрыян**. Існуе павер'е, што на гэты прысвятак журавель раіцца з чарадою перад адлетам у вырай (Анічэнка, 1992). Свяшчэннапакутнік Кіпрыян – карфагенскі епіскап, у 258 годзе быў прыгавораны да смерці за адмову прынесці ахвяру паганскім багам.

Пачатак сяўбы ячменю (шосты ці сёмы тыдзень ад Іллі). У беларусаў Смаленшчыны мелася шмат прыкмет: «Сей ячмень, як загудзець сляпень»; «Сей ячмень, як каліна ў кругу»; «Ячмень сей на сёмым тыдні ад святога Іллі, у той дзень, калі на Усяедным тыдні была вея»; «Ячмень сей на шостым тыдні ад святога Іллі» (Дабравольскі, 1914).

**14/1. *Узвіжанне*** – дзень «закрывання» зямлі на зіму. «На Узвіжанне халат з плеч, а кажух на плечы»; «Узвіжанне з поля збірае»; «На Узвіжання пару гадзюкі й вужакі хаваюцца ў нару» (Паўлюкоўскі, 1934).

Румыны Узвіжанне называлі днём Крыжа (ziиa Crucii). Строга забаранялася есці тое, што хоць трохі сваёй формай напамінала крыж (часнок, арэхі, агурцы і г.д.). Рассылалі падарункі, асабліва дзецям. Называўся яшчэ Змяіным днём (ziиa Serpii). Лічылася, што ад яго да Цёплага Аляксея (17 сакавіка) зямля закрывалася для ўсякіх змеяў і паўзуноў.

У Італіі дзень св. Крыжа (Santa Groce) звязаны з ураджаем хлеба і арэхаў, у Польшчы з другой асенняй стрыжкай авечак: Swiety Krzyz – owce strzyz (Ярмолаў, 1901. С. 470).

**Сымон (Сямён, Стоўб).** У народзе вядома: «У Сямёнаў дзень да абеду ары, а пасля абеду аратага з поля гані» (Дабравольскі, 1914), «Святы Сымон – а й сявец дамоў» (з валачобнай песні). На Віцебшчыне існавалі розныя павер'і наконт ураджаю,

прымеркаваныя да гэтага дня. Напрыклад: «Калі першы засевак жыта рабіць на пярэдадні Івана (28 жніўня), то жыта ўродзіцца з буйным коласам, калі ж напярэдадні Сямёна Стаўба (1 верасня), то яно дасць добрую салому, але не будзе каласістым» (Нікіфароўскі, 1897)

Пра зменлівы характар надвор'я ў прысвятак добра сведчыць прыказка: «Сымон да варот, на дварэ сем пагод: сее, вее, круціць, муціць, зверху лье, знізу мяце» (БСК, 1937). Лічыўся днём адлёту птушак: «На Сымона ластаўкі хаваюцца ў ваду», «На Сымона птушкі лятуць у вырай» (Паўлюкоўскі, 1934).

На Падзвінні да Сямёна імкнуліся падстрыгчы авечак, каб ён не ўкраў сабе на рукавіцы (Іваноў, 1910). А яшчэ казалі: «На Сямёнаў дзень вужы на землю выходзяць» (Ляснічы, 1990).

На Смаленшчыне праводзілі «Жатву» – абрад выгнання мух у час дажынак. Адзявалі сноп у ляльку Салоху, упрыгожвалі, ставілі на стол, затым – у кут. «Адклаўшы сярпы ў бок, жнеі бралі чапялу, садзіліся на яе верхам і скакалі па хаце, гаворачы: «Чарнушнікі – вон, а бялушкі – у хату!». Тады прымаліся прынесенымі альховымі галінкамі выганяць з хаты мух са словамі: «Святы Сямён, гані мух вон!» Гэтыя ўчынкі жней напаміналі, што яны з поля ўжо пайшлі, чорныя мухі хутка знікнуць, а замест іх з'явяцца «бялушкі» (снег) (Дабравольскі, 1914). Абрад выгнання мух штанамі праводзілі на Віцебшчыне (Іваноў, 1910).

Раней на Сямёна праводзілі **абрад «Жаніцьбы коміна»** (пасвета*, лучніка). У ім заўважальны культ агню-багача, хатняга духу-продка, хатніка. І невыпадкова. Бо светлавы дзень скарачаўся, пачынала цямнець і трэба было выконваць некаторую працу пры лучыне. Комін упрыгожвалі ручнікамі, кветкамі, стужкамі. «Частавалі» агонь на пасвеце гарэлкаю, кідалі кавалак сала, зерне, арэхі. Выказваліся пажаданні аб сямейным дабрабыце, каб спорна ішла работа. Жанчыны спявалі вясельную песню «жаніху».

Ой, прыйшлі ж ночанькі доўгенькі,
Пасвяці ж нам, коміну беленькі.
Мы ж цябе кветкамі ўбіралі,
Барвяночкам, рутай аперазалі...

---

* Невялікая металічная рашотка, або патэльня падвешаная да столі пад спецыяльнай квадратнай адтулінай. Звычайна ніжэй адтуліны ўмацоўвалася ўсечаная піраміда, зробленая з дошак. Каб гэты малы комін не загараўся ад лучыны, яго абмазвалі чырвонай глінай, а затым бялілі.

«Маладымі» тут выступалі Комін і Праца. «Праца наша – дзеўка гарненька, палюбіці Коміна радзенька» (Пінск; Шэйн, 1883).

У 1988 годзе абрад зафіксаваны ў Лельчыцкім раёне (в. Дзяржынск) з дзвюма песнямі. (Упершыню яго ўключыў у свой рэпертуар ансамбль народнай музыкі «Жывіца» пад кіраўніцтвам В. Пархоменка.) «Вырывалі з градкі васілька, такі буракова цвет, і ўстаўлялі яго ў дырку, што ў половінцы гарбуза. Потом одзін дзержаў васілька і ўсе за ім ходзілі кругом посьвета і сьпевалі або казалі:

Сьвеці, нашэ сьвеціло,
Шоб огню нам не тушыло,
Шоб добрэ було прасьці, ткаці
І сеець цепло ў хаці.

Ек жэнілі посьвета, то і сьпевалі:

Мой Семенку,
Мой соловейку,
Як тобе хорошенько!
Як зацьвіла калінонька
Да на лютым морозі.
Поцолуймося, моя свацечко,
Да на першом порозі...»

Магчыма, раней выконвалі розныя песні з вясельнага рэпертуару. У абрадзе прымалі ўдзел дзяўчаты, якія ў гэты вечар «запрадалі». Каля пасвету за грабянямі, прадучы, слухалі таксама быліцы, жартавалі, гулялі з хлопцамі.

У.Уласаў выказвае меркаванне, што беларускі абрад адлюстроўвае культ хатняга агню, які выходзіць з мезаліту (1993. С. 121). Асенняе навалоцце раней мела большае значэнне ў жыцці чалавека. Ёсць меркаванне, што на Сымонаў дзень адбываліся «пострыгі» і «сажанне атрокаў на каня» (Ярмолаў, 1901. С. 458).

Царкоўны каляндар адзначае памяць прападобнага Сямёна Столпніка (459 г.), які праславіўся паражальным строгім аскетычным ладам жыцця, крайнімі мерамі самапрыгнечання дзеля служэння Богу. Акрамя таго, 1 верасня (пачатак індыкта) лічыцца царкоўным новалеццем, Новым годам. Ён быў уведзены замест 1 сакавіка Маскоўскім Саборам у 1492 годзе, хаця раней быў уведзены імператарам Канстанцінам Вялікім у гонар перамогі 1 верасня 312 года над Максентыем, калі была падаравана хрысціянам поўная воля выражаць сваю веру.

Падобныя святкаванні запальвання ў майстэрнях святла для вячэрняй работы былі шырока вядомы Еўропе, дзе гаспадар частаваў сваіх майстроў. Аднак яны ў меншай ступені, чым

беларускі матэрыял выяўляюць змест Новага года. Па ўскосных традыцыях, якія вядомы ў некаторых краінах, можна толькі здагадвацца пра існаванне ў мінулым падобных святкаванняў. Напрыклад, у народаў Бельгіі і Нідэрландаў існаваў даўні звычай, прымеркаваны да пачатку верасня, калі можна было пераходзіць да штучнага асвятлення, звычайна керасінавымі лямпамі [1978, с. 65]. Так, у Фінляндыі бліжэй да восеньскага раўнадзенства, 11 верасня, у дзень святога Аляксандра, адзначалі свята рамеснікаў, калі ўпершыню пасля лета запальвалі святло. Пра Міхайлаў дзень гаварылі: “Лучына ў лучнік, кудзеля ў пралку, капуста ў кацёл, жанчына ў хату, рэпа ў пограб”. У Даніі ён праводзіўся на Міхайла, у Германіі – на тыдзень раней (КЗ, 1978. С. 117). Традыцыі германцаў сведчаць пра дзяленне года на дзве палавіны: ад вясны і да восені. Там гавораць: “Michaeli zundet das Licht an, und Joseph loschtes aus” – “Міхаіл запальвае святло, а Іосіф тушыць” (с. 131).

У сербаў, чарнагорцаў і македонцаў Сімяон – апякун аратаяў. Праводзілі свята севу з народнымі звычаямі. У некаторых раёнах Македоніі дзень святога лічыўся пачаткам земляробчага года (с. 217). На брытанскіх астравах быў зафіксаваны цікавы “танец рогаў”, які выконвалі 4 верасня 12 мужчын (а можа па колькасці месяцаў?) , пераапранутых у аленяў, вершнікаў, паляўнічых і інш [с. 92].

Асаблівыя святкаванні яшчэ да нядаўняга часу, звязаныя з вераснёскім стылем, праводзіліся ў Грэцыі. У іх вылучаецца сімволіка і традыцыі абходу святароў хат з віншаваннямі, выкарыстанне вянкоў, зелені і вады, ахвяраванне свежым мясам добраму духу ў выглядзе змяі. Па назіраннях даследчыкаў, многае перанята са звычаяў 1 сакавіка і 1 студзеня [с. 278].

Даследчыкі культуры народаў Еўропы адзначаюць, што ў XVIII ст. “карнавальны акцэнт на ежы і пітве, здаецца, знік з гэтых вясновых і летніх святаў, але зноўку ажывае ўвосень”, напрыклад, на Сіцыліі “пасля збору ўраджаю сяляне адзначаюць народнае свята, падобнае да оргіяў” [Бэрк, с. 225].

**Бабіна лета.** У некаторых раёнах лічылася пачаткам Бабінага (Бабскага) лета. Прыбіралі агароды, сушылі і апрацоўвалі лён і каноплі.

З гэтай назвай асацыіруюцца наступныя паняцці і характарыстыкі: апошняя сонечная цеплыня, лётанне павуціння, асаблівая пара жаночых сельскагаспадарчых работ, кароткае «лета».

Маецца і навуковае тлумачэнне гэтай з'яве, як першага асенняга перыяду з устойлівым антыцыклічным надвор'ем, калі начное астыванне глебы і паветра яшчэ не вельмі моцнае, а дзённы прагрэў, хоць і адчувальны, але не такі, каб успрымаўся як спякота.

Звычайна такі перыяд пачынаецца пасля асенняга раўнадзенства, 22 – 23 верасня і працягваецца адзін два тыдні. Зямля паварочваецца да Сонца паўднёвым паўшар'ем і пасылае развітальнае цяпло на зямлю (Макарэвіч, 1994. С. 85).

Падобны асенні перыяд вядомы многім народам і называецца па-рознаму: «лета св. Вячаслава» у чэхаў (з 28 вер.), «Міхайлаўскае лета» у немцаў (з 29 вер.), «лета св. Брыгіты» у шведаў (з 8 кастр.), «I'Ete de la St. Denis» у французаў (каля 9 кастр.), «Altweiber Sommer» -- Бабуліна лета – у немцаў, «лета св. Тэрэзы» ў італьянцаў, «St. Luke's little summer» -- «малое лета» у англічан каля 18 кастр., «Мартынава лета» у немцаў, французаў і італьянцаў з 11 ліст., а таксама «Бабіны марозы» (карпацкія славяне), «Сяменна панна Марыя» (чэхі), «Індыйскае лета» (Амерыка), «Лета св. Марціна» (Францыя), «Бабуліна лета» (Германія), «Малое лета», або «Лета св. Дзмітрыя» (Грэцыя).

Асобным каляндраным перыядам ў народаў Югаславіі, крыху падобным на Бабіна лета, была Паміждневіца (Мевудневнице, Изамед госпојина і інш. – сербы, чорнагорцы; mei Stomorinamj – харваты; Medmasni cas – славенцы) паміж Успленнем і Раством Багародзіцы (15.08 – 8.09 у каталікаў, або 28.08 – 21.09 у праваслаўных).

**19/6. Цуды (Міхайла)** – прысвятак, асацыіруецца з «цудам». Не палілі святло ў хлявах. Існуе шмат паданняў пра незвычайныя дзівосы, якія здараюцца з людзьмі ў гэты дзень. У Ашмянскім павеце сцвярджалі, нібы на Міхайла такі бывае моцны вецер, што «верне озероды з бобам і гарохам» (Берман, 1874). У Свіслацкім раёне заканчваюць палявыя работы і гавораць: «Міхал з поля спіхаў».

Дзень «цудаў», што могуць прынесці бяду. Звязаны з Прачыстай. На Піншчыне казалі: «Не так бойся Прачыстай, як Цуда яе», а на Лельчыччыне: «Прачыста гаворыць: «Мяне не святкуй, а святкуй маё Цуда» (Талстая, 1986).

Цікавы звычай існаваў у вёсцы Моталь Іванаўскага раёна. На Цуда дзяўчына ішла на скрыжаванне дарог, станавілася на калені, дзевяць разоў чытала малітву «Ойча наш», затым зубамі адрывала лісток падарожніка і гаварыла:

Ты, святый падарожнік,
Ты стаіш пры дарозі,
Бачыш старога й малого,
Покажы мне мілого...

Да дому вярталася, ні з кім не размаўляючы. Лісток падарожніка клала пад падушку, каб прысніўся суджаны.

Народнае ўяўленне аб цудзе ў дзень Архістраціга Міхала (IV стагодзе) асацыіруецца з цудам, якое здзейсніў Святы Міхаіл. Ён сваім жэзлам адкрыў у гары шырокую адтуліну і накіраваў праз яе магутны паток вады прама на храм Архістраціга Міхаіла.

**21/8. Багач (Багатнік, Багатуха, Гаспожка Багатая, Малая Прачыста, Прачыста, Другая Багародзіцца, Другая Прачыста, Другая Спажа, Спожка, Другі святок, Нараджэнне Божае Маці, Зельная),** старажытнае свята заканчэння ўборкі зернавых, водгук язычніцкага свята земляробчага культу «бога сонца, бога дастатку і багацтва» (Багдановіч, 1895). Гэтае боства ганаравалася і ў іншыя дні, якія стаяць блізка да асенняга раўнадзенства. У некаторых раёнах лічылася першым днём восені. Гаварылі: «Другі святок – восень, браток» (Паўлюкоўскі, 1934); «Першы асенні дзень быццам-то ў Другую Прачыстую Мацер Божую: ета мо і праўда, бо тады і ліства жоўкне, і ночы халадней, а ўсё ж такі восень справядлівая тады, калі па начах прымаразкі» (Пяткевіч, 1938). Цяпер прымеркавана да Раства Багародзіцы (у праваслаўных), Дзевы Марыі (у католікаў). Як не безпадстаўна заўважаюць фальклрарысты, што царква ў нас імкнулася надаць Багачу праз удзел святара ў яго абрадах хрысціянскае адценне, аднак язычніцкая сутнасць, звязаных з ім рытуалаў не пакідае сумневу ў яго дахрысціянскім паходжанні і характары (Ліс, 1998. С. 147). І яшчэ адну важную і смелую заўвагу скурпулёзнага даследчыка неабходна прыняць аб недастатковасці аргументаў у сцверджанні А. Багдановіча, а следам за імі наступных аўтараў, у аналогіі Багача і Дажджбога. Б.Рыбакоў, У.Уласаў і інш. бачаць 8-9 верасня (па с. ст.) святы рожаніц, што ідуць з верхняга палеаліту.

Багачом або багатцам называлі таксама кошык з жытам і свечкаю. Яго на свята насілі ў кожную хату і адрыну. Зерне ў кошык збіралі з першага зажыначнага снапа, свечку рыхтавалі пад спеў дажынкавых мелодый. Згодна павер'ям, Багач забяспечваў сям'і дабрабыт і шчасце. Адно з вядучых месцаў займаў святар у свяце, якое на хрысціянскі манер называлі **Святам Свечкі**. Падобныя святкаванні праводзілі і ў іншыя дні календара.

Найбольш поўным апісаннем абрадаў Багача знаходзім у Адама Багдановіча. «“Багач” стаіць на працягу года ў доме чарговага гаспадара ў ганаровым куце пад абразамі. У гэты дзень свечка запальваецца. Запрашаецца святар для служэння, якое і адбываецца перш за ўсё ў той хаце, дзе стаіць “багач”. Потым гаспадар следам за святаром нясе “багача” ў наступны двор, дзе іх сустракаюць гаспадары. Для сустрэчы ставяць на двары стол, засланы белым пакрывалам з кошыкамі жыта, пшаніцы, ячменя або

іншага зерня. “Багач” таксма ўганароўваецца на стол і праводзіцца кароткае набажэнства. Святар і ўсе яго суправаджаючыя запрашаюцца ў хату для частавання, пры гэтым “багач” ставіцца на покуцці…

На другі канец вёскі збіраецца ўся жывёла, і калі абыйдуць усе двары, то абносяць “багача” вакол яе. Пасля гэтага адносяць яго ў хату да чарговага гаспадара, дзе і застаецца цэлы год. Па павер’ю ён прыносіць у жыллё багацце і шчасце.

У некаторых мясцовасцях жыта і воск для “багача” збіраецца з усёй вёскі і замяняецца толькі тады, калі кошык па чарзе абыйдзе ўсё сяленне або калі згарыць свечка. У іншых краях жыта і свечка замяняюцца штогод чарговым гаспадаром пры гэтым жыта для яго малоцяць з першага, “зажынкавага”, снапа. У апошнім выпадку замененае “багачовае” жыта змешваецца са звычайным і ўжываецца для севу. Прыгатаванне свечкі суправаджаецца агульнымі вячоркамі ўсіх удзельнікаў і асобнымі песнямі, якія напамінаюць дажынкавыя.» (Багдановіч, 1895. С. 124-125).

З царкоўным календаром звязана цікавая народная легенда. Як вядома, у многіх раёнах лічылася, што на 21 верасня заканчваецца «бабіна лета». Гэта і лагічна, бо з'яўляецца напярэдадні асенняга раўнадзенства. Дык вось. Марыя, маці Ісуса, спрабавала сшыць перададзеную ёй вяшчунамі пялёнку для сына. Але вецер яе панёс. Праз колькі гадоў, калі Святая Марыя плакала каля распятага на крыжы сына, ніткі, якія калісьці вырваліся з яе рук, сабраліся з усіх канцоў свету і, абвіўшыся вакол крыжа, утварылі выратаваную мяккую пяленку. З-пад яе пачуўся голас: «Мама, мама, навошта ты імкнешся зменшчыць мае пакуты? Ніткі Прасвятой Дзевы, пакіньце мяне і ідзіце закрываць гора чалавечае!» Вось з таго часу і лятаюць ніткі-павуціны па ўсяму свету пасля дня нараджэння Багародзіцы (Макарэвіч, 1994).

На Багача да ўсходу сонца гаспадар засяваў ніву жытам, асвечаным яшчэ ў Першую Прачыстую. «Прыйшоў Багач – кідай рагач, бяры сявеньку, сей памаленьку», -- агульнавядомая прыказка. У Віленскай губерні з новага ўраджаю пяклі вялікі каравай, таму і называлі дзень Гаспожкай Багатай (Берман, 1874). Акрамя жыта, дзень быў звязаны і з іншымі атрыбутамі, складнікамі свята. Капалі бульбу. На Віцебшчыне жанчыны хадзілі натоўпам на ільнішчы са словамі: «Ніхай будзіць лён такей даўгей, колькі мы прайшлі!» (Нікіфароўскі, 1897); на Гродзеншчыне моладзь мела звычай выбіраць сабе пару, кумы вялі адпаведныя роспыты, рыхтаваліся да вяселляў (Раманаў, 1911).

Да свята стараліся закончыць касавіцу, і з тае нагоды ў Драгічынскім раёне казалі: «Прачыста – сывба чыста, а косьба нычыста» (Талстая, 1986). Як сцвярджалася, лепш сеяць паміж Першай і Другой Прачыстай. А, наогул, існавалі тры этапы сяўбы азімага: ранні (пасля Спаса), сярэдні (праз 2 тыдні) і позні (каля Багача). У валачобнай песні гаворыцца:

Прачыстая Большая
Жыта свенціць,
Засяваець,
А Меншая
Памагаець.
А Узвіжанне –
З поля дзвігні.

*(Дзісенскі павет;*
*Чэрны, 1895)*

Перад Прачыстай буслы збіраюцца ў вырай. На Шуміліншчыне існуе прыкмета: калі паляціць бацян яшчэ да Другой Багародзіцы, то ляжа ранняя зіма. Асенняе свята добра прадстаўлена прыказкамі: «У стагнача хопіць хлеба да Багача»; «Багач заткнуў за страху рагач» (магчыма, саху або матычку. – А.Л.); «Прыйшоў Багач – рыхтуй рагач, прыйшла Пакрова – рыкнула карова»; «Да Багача баба рабача, па Багачы – хоць за плот валачы».

Восеньскае свята з'яўляецца адметнасцю беларусаў, бо падобнай і багатай абранасці ў гэты дзень не заўважалася ў суседніх народаў. А калі і наглядаецца то носіць хрысціянскі характар, нават у назвах: Matka Boska Siewna, Bogorodzica ў Польшчы, Santa Maria ў Італіі і г.д.

**Засідкі** – пачатак хатніх жаночых работ, прадзення. «Засідкі – бабы ўзяліся за верацяно» (Ельнінскі павет; Дабравольскі, 1914).

**22 – 23**. Дзень астранамічнага асенняга раўнадзенства.

**24/11. Тадора (Фёдар, Фядорын дзень).** У пару асенняга раўнадзенства прысвятак напамінаў аб важнай змене ў годзе: «На Тадору ўсякае лета канчаецца» (БСК, 1913) і пацвярджалася, што на Фёдара адлятаюць стрыжы (Анічэнка, 1992).

**26/13. Стаўры, Стаўроўскія Дзяды** – памінальны звычай. Па сведчанню збіральніка фальклору і святара с.Гняздзілава Аляксандра Троіцкага, Стаўры спраўляліся на Віленшчыне напярэдадні Узвіжання. Малолася новае зерне на пірагі, колькасць якіх адпавядала членам сям'і, і перапечкі для жабракоў і царквы. Рэзалася авечка, вырыўся крупнік і квас. Жанчыны галасілі па памерлых родзічах, наладжвалі традыцыйную вячэру. Той жа святар (царква таксама прымала ўдзел у адзначэнні памерлых) заўважаў: у

Стаўрах «адзін усяго забабон у тым, што селянін верыць у прыход на вячэру сваіх нябожчыкаў» (Троіцкі, 1875).

Па сведчаннях з Дзісенскага павета Стаўроўскія Дзяды адзначалі перад Тройцай і яны мелі язычніцкае паходжанне (Дзмітрыеў, 1869).

**27/14. Здвіжанне (Уздзвіжанне, Звіжанне, Хрыст, Часнэйка)** – свята «закрывання» зямлі на зіму, якое звязана з вужамі і мае значэнне «руху». Лічылася, што сонца і прырода «грае, здзвігаецца», «іграе і дрыжыць» усімі колерамі. «На Узвіжанне халат з плеч, а кажух на плечы» (Паўлюкоўскі, 1934). «К Звіжанню ўсё далжно быць здзвінута – г. зн. увесь хлеб азімы і яравы павінен быць звезены з поля» (Дэмбавецкі, 1882. С. 519). «На Здзвіжання – бацюшка ў цэркві здзвігаіцца» (Раманаў, 1912. С. 278; Рагачоўскі раён. Сысоў. С. 217). «Дзвіжанне – гадзюкі здзвігаюцца ў кучу» (Навасібірская вобл., ад беларусаў з Магілёўскай губерні; Васілевіч, 1998. С. 529). У гэты дзень не хадзілі ў лес, бо там нібы збіраліся ў клубкі гадзюкі і вужы, каб схавацца ў норы на зіму. Існуе легенда, нібы ў цара гадзюк на галаве ёсць залатыя рожкі. Трэба раніцай на Звіжанне ўпільнаваць, калі будзе грэцца на сонцы клубок гадзюк з царом і ўдарыць па ім адзін раз «папліскаю» – схапіць рожкі і збегчы. Лічыцца, што такая карона здымае ўсе замкі і запоры. Лоўка ёю карыстацца зладзеям (Слуцкі павет; Сержпутоўскі, 1930). Загаварвалі кароў ад гадзюкі (Басько, 1997. № 11). У замовах цара вужоў называлі па-рознаму, у тэсце з Кармяншчыны апавядаецца: «Прыедзе святы Юры на белым коніку з вострай коп'ёй, з вострай мечай, з колкай шупшынаю, стрыкучай крапіваю. На свентым Здзвіжэнні будзе вам там крушэнне...» (Замовы. С. 125).

Увесь тыдзень («свістун») не сеялі, каб не было пустога калосся. На Тураўшчыне гаварылі: «До Йвана сяўба кохана, а послі Здзвіжанья трэ добро рукою дзвігаць!» (Тураўскі сл., 1982). У валачобных песнях ёсць такія словы: «Святая Прачыста папары мяшаець, Сятое Узвіжанне з поля збіраець», «бульбу капаець», «сцеліць лянок».

Гэты дзень называлі і «Часнэйка», таму што ўпершыню пасля Вялікадня дазвалялася паесці часнаку той сям'і, у хаце якой быў нябожчык (Нікіфароўскі, 1897. С. 255). Смаленскія беларусы яшчэ называлі «Хрыст» ці «Хрыстос» (Дабравольскі, 1894. С. 104).

У назіраннях за прыродай значная роля адносіцца птушкам, якія забіралі з сабой лета. «Узвіжанне – апошні воз з поля рушыў, а птушкі ў вырай пацягнуліся»; «Узвіжанне лета замыкае, ключык шызая галачка за мора панесла» (Ляснічы, 1990).

Можна маркаваць аб тым, што ў дахрысціянскі перыяд нашы продкі ў асеннюю пару займаліся магіяй супраць гадзюк, бо нямала слядоў гэтага засталося ў фальклоры. У рускіх традыцыі былі скіраваны на ўборку і засолку капусты, таму і называліся уздзвіжанскім «капустным тыднем» (Усаў. С. 307). Даследчыкі лічаць (Власаў, 1993. С. 104) што змяіныя святы славян (яшчэ 7 красавіка) бяруць пачатак з верхняга палеаліту (с XLII – XL па XII-X тыс. да н.э.), як і свята мядзведзя, што прыходзіцца на гэты дзень (с. 111).

Зыходзячы з наяўнага фальклорнага матэрыялу, складваецца ўражанне, што хрысціянскае значэнне свята беларусам не было зразумела і асацыяцыя са словамі «рух» (здвиг) узнікла ў хрысціянскі перыяд. А ён прынес свята людзям 13 верасня 335 г., калі быў асвечаны ў Канстанцінопалі храм ў гонар Уваскрашэння Хрыстова на месцы знішчэння язычніцкага капішча, пад якім былі знойдзены Труна і Крыж Гаспадыні і ўстаноўлены («воздвигнуты») на радасць хрысціян. У наступны дзень і сталі адзначаць свята Устанаўлення Чэснага і Жыватворнага Крыжа Гасподняга.

Як сведчаць летапісы, там гэты дзень вядомы пад назвай «Стаўрова дня», што тлумачыцца грэчаскім словам «саурос» – крыж (Усаў. С. 306). У нас захавалася гэтае слова ў папярэднім дні «Стаўры, Стаўроўскія Дзяды».

Сербы, чарнагорцы і македонцы прысвятак «Крстовдан» прысвячалі дню здароўя чалавека. Існавалі забароны на асобныя стравы, збіралі лекавыя васількі, даглядалі жывёлу. Да Крстова дня быў прымеркаваны і сельскагаспадарчы каляндар. Збіралі кукурузу, слівы, мёд. Сербы пачыналі сеў, у звычаях якога праглядваліся рысы ахвяравання духу зямлі (с. 217). У Харватыі і Славеніі ў перыяд Междуневніцы (з 15.08 па 21.09) існавала забарона забірацца на дрэвы, таму што змеі там бываць у гэты час (с. 216).

**29/16. *Міхал*.** «На Міхала ясная ноч – будзе трывалая зіма. Калі на Міхала з поўначы вецер вее, то ня май на надвор'е надзеі» (БСК, 1937; Сахараў, 1937).

У Заходняй Еўропе з днём Міхеля (Michielsdag – галандск.) таксама звязана шмат метэаралагічных прыкметаў: па надвор'і 29 верасня прадказвалі стан усіх пораў года, будучы ўраджай (КЗ, 1978. С. 65-66.). Як і ў нас звяртаюць увагу на вецер: паўночны і ўсходні – на моцную сцюжу зімою, а французы пасля паўночнага чакаюць сухога кастрычніка. У Скандынавіі дзень Мікеля (Mickelmassan, Michalesdagen) – свята заканчэння летнеасенніх работ, дзень кірмашоў і гандлю. Прымаўкі фінаў таксама аб гэтым сведчаць: «З Міхаіла жанчыны ў хату, бульба ў пограб», «Лучына ў

лучнік, кудзеля на грэбень, капуста ў кацёл, жанчына ў хату, рэп ў пограб» (с. 117).

Германцы раней палілі кастры на свята і звязвалі яго з асеннім раўнадзенствам: «Міхаэлі запальвае святло, Ёсеф тушыць» -- «Michaeli zundet das Licht an, und Joseph loscht es aus» (с. 131). Іосіф – у сакавіку. Галоўная страва, як і на Марцінаў дзень, быў смажаны гусь. Існуюць і звычаі, звязаныя з хрысціянскім Міхаілам–архангелам.

Сербы і чарнагорцы звязвалі свае звычаі і абрады з мэтай абароны мараплавальнікаў, славенцы – з барацьбой са злою сілаю, што выступае супраць чалавека і зямлі. У рытуале прысвятка праглядаўся культ продкаў. У Славеніі (Mihelevo) – пачатак восені.

Міхаіл з'яўляецца найбольш папулярным святам у ірландцаў і шатландцаў. Яго лічылі ахоўнікам мора і маракоў, коней і вершнікаў. Шатландцы называлі яго Michael nam Buuder – Міхаіла Пералаганосцам і асацыіравалі яго ў многіх краінах з Георгіем. Нямала язычніцкага бачыцца ў адзначэнні хрысціянскага святога, які лічыцца заменіў адзін са старажытных культаў. У Шатландыі пачатак восені 29 верасня: «Лета ёсць лета да дня святога Міхаіла» (с. 81).

**Сіцыян**, прысвятак, які звязаны са льном. У валачобнай песні значыцца:

Свята Ўздзвіжэня да з поля здзвіжыла.
Святы Сіцыян да ляны пасцілаў,
Святы Бугаслаў да буракі капаў.
*(Смалявіцкі раён; Мінская вобл. С. 37)*

Іншых загадкаў пра прысвятак пакуль не знойдзена. Магчыма, так адзначаны дзень паміж Уздзвіжаннем і Бугаславам у гонар хрысціянскага пакутніка Севасціяны (І стагоддзе).